ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік упраўлення культуры
Гродзенскага аблвыканкама
А.В. Клімовіч
8 студзеня 2024 г.

ІНСТРУКЦЫЯ
аб парадку арганізацыі і правядзення абласнога фестывалю-конкурсу калектываў інструментальнага жанру "Мелодыі Гродзеншчыны"

1. Дадзеная Інструкцыя вызначае парадак арганізацыі і правядзення абласнога фестывалю-конкурсу калектываў інструментальнага жанру "Мелодыі Гродзеншчыны" (далей – Фестываль-конкурс).

2. Мэтамі і задачамі Фестывалю-конкурсу з'яўляюцца: садзейнічанне мастацкаму развіццю і павышэнню выканальніцкага ўзроўню інструментальных ансамбляў і аркестраў; павышэнне і ўзбагачэнне рэпертуару калектываў мастацкай творчасці інструментальнага жанру; папулярызацыя інструментальнай музыкі.

3. Арганізатарамі Фестывалю-конкурсу з'яўляюцца: упраўленне культуры Гродзенскага аблвыканкама, дзяржаўная ўстанова культуры "Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці" (далей – ДУК "Гродзенскі АМЦНТ"), сектар культуры Свіслацкага райвыканкама.

4. Для кіраўніцтва падрыхтоўкай і правядзеннем Фестывалю-конкурсу ствараецца арганізацыйны каміэт (далей - аргкамітэт), які фарміруецца з прадстаўнікоў дзяржаўных органаў і зацікаўленых арганізацый (дадатак 1).

5. Фестываль-конкурс праводзіцца 1 раз у два гады.

6. У 2024 годзе Фестываль-конкурс адбудзецца 17 лютага ў г. Свіслач.

7. У Фестывалі-конкурсе прымаюць удзел лепшыя дарослыя і дзіцячыя інструментальныя калектывы Гродзенскай вобласці, незалежна ад іх ведамаснай прыналежнасці.

8. Да ўдзелу ў Фестывалі-конкурсе калектывы рыхтуюць 2 інструментальныя творы працягласцю да 6 хвілін, адзін з якіх абавязкова беларускага аўтара.

9. Журы Фестывалю-конкурсу (дадатак 2) ацэньвае калектывы ў дзвюх узроставых катэгорыях: дзіцячая (да 15 гадоў уключна), дарослая (ад 16 гадоў і болей) у наступных намінацыях:

аркестр;

ансамбль (акрамя дуэтаў, трыа, квартэтаў).

10. Па выніках Фестывалю-конкурсу пераможцам прысвойваюцца званні лаўрэатаў (I, II, III ступеняў) і ўручаюцца дыпломы ў рамках і прызы.

11. Астатнія калектывы атрымліваюць дыпломы за ўдзел у Фестывалі-конкурсе.

12. Пры адсутнасці ўдзельнікаў у намінацыі або ўзроставай катэгорыі журы Фестывалю-конкурсу пакідае за сабой права аб’ядноўваць намінацыі, не прысвойваць месцы, вызначаць дадатковыя намінацыі ў межах выдзеленага прызавога фонду.

13. Выступленні калектываў ацэньваюцца па наступных крытэрыях: выканальніцкае майстэрства; сцэнічная культура; мастацкі ўзровень рэпертуару і якасць апрацоўкі (аранжыроўкі); рэжысёрскае і мастацкае афармленне нумару; артыстызм, арыгінальнасць выканання; выкарыстанне рэгіянальнага матэрыялу; касцюміраванне.

14. Рашэнне членаў журы па выніках Фестывалю-конкурсу фіксуецца ў пратаколе (падпісваюць усе члены журы), які размяшчаецца не пазней 10 каляндарных дзён з дня правядзення Фестывалю-конкурсу на афіцыйным сайце ДУК “Гродзенскі АМЦНТ”.

15. Рашэнне журы з’яўляецца канчатковым і перагляду не падлягае.

16. Для ўдзелу ў Фестывалі-конкурсе неабходна прыслаць заяўку (дадатак 3) ад раёнаў Гродзенскай вобласці і г. Гродна незалежна ад ведамаснай прыналежнасці калектываў **да 1 лютага 2024 г.** з пазнакай “Мелодыі Гродзеншчыны” па адрасе: 230025, г.Гродна, вул.Савецкая, 8, ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”; e-mail: info@gromc.by, кантактны тэлефон:+375 152 623782.

17. Фінансаванне фестывалю-конкурсу ажыццяўляецца за кошт сродкаў абласнога бюджэту, прадугледжаных у каштарысе ДУК “Гродзенскі АМЦНТ”.

18. За кошт бюджэтных сродкаў фінансуюцца: прызы, дыпломы, рамкі для дыпломаў.

19. Для фінансавання Фестывалю-конкурсу на ўсіх этапах могуць быць выкарыстаны іншыя крыніцы, не забароненыя заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

20. Арганізатары Фестывалю-конкурсу захоўваюць неабмежаваныя правы на запіс і распаўсюджванне выступленняў калектываў рознымі тэхнічнымі сродкамі і спосабамі. За дадзеныя запісы ганарары выканаўцам не выплачваюцца.

Дадатак 1
да інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення абласнога фестывалю-конкурсу калектываў інструментальнага жанру "Мелодыі Гродзеншчыны"

## СКЛАД АРГКАМІТЭТА
абласнога фестывалю-конкурсу калектываў інструментальнага жанру "Мелодыі Гродзеншчыны"

| | |
|---|---|
| Куратчык С.В. | намеснік начальніка ўпраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама, *старшыня аргкамітэта*; |
| Пачобут Т.С. | загадчык сектара культуры Свіслацкага райвыканкама, *сустаршыня аргкамітэта*; |
| Хільмончык К.В. | дырэктар ДУК "Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці", *намеснік старшыні аргкамітэта*; |
| Далідоўская М.М. | дырэктар ДУА "Свіслацкая дзіцячая школа мастацтваў"; |
| Мацкевіч Т.Л. | дырэктар ДУК "Свіслацкі раённы цэнтр культуры і народнай творчасці"; |
| Мерчы Т.І. | вядучы метадыст ДУК "Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці"; |
| Пекар А.Ю. | галоўны спецыяліст аддзела культурна-асветнай работы, мастацтваў і навучальных устаноў упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама |

Дадатак 2
да інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення абласнога фестывалю-конкурсу калектываў інструментальнага жанру “Мелодыі Гродзеншчыны”

# СКЛАД ЖУРЫ
абласнога фестывалю-конкурсу калектываў інструментальнага жанру “Мелодыі Гродзеншчыны”

| | |
|---|---|
| Казека Д.В. | выкладчык УА “Гродзенскі дзяржаўны музычны каледж”, *старшыня журы*; |
| Куратчык С.В. | намеснік начальніка ўпраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама, *сустаршыня журы*; |
| Пачобут Т.С. | загадчык сектара культуры Свіслацкага райвыканкама, *намеснік старшыні журы*; |
| Далідоўская М.М. | дырэктр ДУА “Свіслацкая дзіцячая школа мастацтваў”; |
| Пекар А.Ю. | галоўны спецыяліст аддзела культурна-асветнай работы, мастацтваў і навучальных устаноў упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама; |
| Хільмончык К.В. | дырэктр ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці” |

Дадатак 3
да інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення абласнога фестывалю-конкурсу калектываў інструментальнага жанру “Мелодыі Гродзеншчыны”

**Форма заяўкі**

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік (загадчык) аддзела (сектара) культуры гар(рай)выканкама
2024 г.

ЗАЯЎКА
на ўдзел у абласным фестывалі-конкурсе калектываў інструментальнага жанру “Мелодыі Гродзеншчыны”

1. Раён(горад)____________________________________________
2. Поўная назва калектыву____________________________________
3. База дзейнасці калектыву___________________________________
4. Намінацыя______________________________________________
5. Узроставая катэгорыя (дзіцячая, дарослая)____________________
6. Назва, аўтары і працягласць кожнага нумару __________________

____________________________________________________________

____________________________________________________________

____________________________________________________________

7. Прозвішча, імя, імя па бацьку кіраўніка калектыву______________

____________________________________________________________

8. Тэлефоны (службовы, мабільны) __________________________
9. Колькасць удзельнікаў _____________________________
10. Тэхнічнае забеспячэнне (колькасць мікрафонаў, крэслаў)
11. Творчая характарыстыка (не больш 50 слоў)

Кіраўнік базавай установы ________________________

Заяўкі дасылаюцца да 1 лютага 2024 г. на адрас: 230023 г.Гродна, вул.Савецкая,8. ДУК “Гродзенскі АМЦНТ”, с пазнакай “Мелодыі Гродзеншчыны”. Кантактныя тэлефоны: 8(0152)623782; тэл./факс: 8(0152)623787, e-mail: info@gromc.by.